АДКРЫТАЕ АКЦЫЯНЕРНАЕ ТАВАРЫСТВА
«ЛІДСКАЕ ПІВА»

вул. Міцкевіча, 32, 231300,
г. Ліда, Гродзенская вобласць,
Рэспубліка Беларусь
тэл. +375 154 53 53 00,
факс +375 154 53 53 03,
www.lidskae.by

разліковы рахунак
BY37PJCB30126102861000000933
«Прiорбанк» ААТ, ЦБП 602
(г. Ліда, вул. Перамогі, 30),
код банка (БІК) PJCBBY2X,
УНП 500022116, АКПА 00391808

18 76

ЛІДСКАЕ

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
«ЛИДСКОЕ ПИВО»

ул. Мицкевича, 32, 231300,
г. Лида, Гродненская область,
Республика Беларусь
тел. +375 154 53 53 00,
факс +375 154 53 53 03,
www.lidskae.by

расчетный счет
BY37PJCB30126102861000000933
«Приорбанк» ОАО, ЦБУ 602
(г. Лида, ул. Победы, 30),
код банка (БИК) PJCBBY2X,
УНП 500022116, ОКПО 00391808

№5439 от 31.07.2017
На № кол-294 от 11.07.2017

Паважаны [redacted]!

Дзякуем Вам за зварот і ўвагу да дзейнасці ААТ "Лідскае піва". Нам вельмі важна ведаць, што думаюць спажыўцы наконт нашай прадукцыі, у тым ліку яе пакавання і камунікацыі.

Наша прадпрыемства шчыра паважае беларускую мову, і мы шмат працуем над тым, каб задаволіць густы як мага большай колькасці нашых прыхільнікаў. У адказ на Вашыя прапановы можам адказаць наступнае:

- У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь у нашай краіне прынятыя дзве дзяржаўныя мовы - беларуская і руская. Яны прызнаны роўнымі на ўзроўні заканадаўства. Улічваючы тое, што прадукцыя нашага прадпрыемства пастаўляецца ў розныя краіны, у тым ліку і ў Расію, і ў краіны постсавецкай прасторы, зараз у большасці прадуктаў мы выкарыстоўваем мову, якая будзе даступна і беларускамоўным, і рускамоўным людзям.

- За 2016 год у піўным партфелі кампаніі з'явіліся 3 беларускамоўныя брэнды, зараз іх доля складае 1/3 ад усяго піўнога партфелю. Акрамя брэндаў "ЛІДСКАЕ" і "Менскае" па-беларуску размаўляе і брэнд крафтавага піва "Калекцыя Майстра". Пры гэтым варта улічваць, што наша прадпрыемства, з'яўляючыся часткай фінскага канцэрна OLVI, часткова імпартуе, а таксама часткова вырабляе напоі па ліцэнзіі – на гэтай падставе значная частка нашай прадукцыі не можа быць пераведзена на беларускую мову. Мы не выключаем, што новыя прадукты з цягам часу будуць прытрымлівацца беларускай мовы. Аднак гэта залежыць ад мноства фактораў, у тым ліку фінансавых і часовых.

- ААТ "Лідскае піва" заявіла пра пераход карпаратыўнай камунікацыі на беларускую мову, што, на наш погляд, такая ж адказная і важная справа, як пераход на бедарускую мову этікетак брэндаў "ЛІДСКАЕ", лімітаванай серыі "Менскае" і серыі крафтавага піва "Калекцыя Майстра". Значныя змены ў карпаратыўных камунікацыях Вы можаце назіраць і зараз. Напрыклад, у 2016 годзе мы прэзентавалі новы карпаратыўны сайт lidskae.by, галоўная версія якога – беларускамоўная. Наша кампанія плануе працягваць гэта працэс і пашыраць ужыванне беларускай мовы на ўсіх узроўнях нашей дзейнасці.

На падставе пункта 6 артыкула 20 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб звароце грамадзян і юрыдычных асоб» ад 18.07.2011 №300-З сапраўдны адказ на зварот можа быць абскарджаны ў судзе ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

Менеджар па карпаратыўных камунікацыях Яфімкіна Н.А.

Вык.: Мікалаева Н.А.
nadezhda.nikolaeva@lidskoe.by
+375-29-646-48-69